Н. Д. Смарцэлава

# ТЭМАТЫЧНЫ КАНТРОЛЬ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

## 8 КЛАС

*Дапаможнік для настаўнікаў*
*устаноў агульнай сярэдняй адукацыі*

Мазыр
«Выснова»
2023

# АД АЎТАРА

Вучэбная праграма па беларускай мове вызначае ў якасці адной з задач навучання мове фарміраванне камунікатыўных уменняў на аснове авалодання маўленчай тэорыяй і культурай маўлення, спосабамі перадачы думкі ў вуснай і пісьмовай формах, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў (маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя).

Фарміраванне камунікатыўных уменняў вучняў працягваецца і пры вывучэнні тэм "Сінтаксіс" і "Пунктуацыя". Работа з тэкстам на ўроках беларускай мовы ў восьмым класе таксама прадугледжвае наладжванне міжпрадметных сувязей з вучэбным прадметам "Беларуская літаратура". Узорныя ў мастацкіх адносінах тэксты пісьменнікаў-класікаў і сучаснікаў варта выкарыстоўваць у якасці базавага тэксту для работы з матэрыялам па тэме ўрока.

Фарміраванне цікавасці да канкрэтнага мастацкага твора ці да чытання ўвогуле — прагназуемы вынік работы з мастацкім тэкстам на ўроку беларускай мовы. Выкарыстанне нестандартных заданняў, складзеных на матэрыяле тэкстаў, дазволіць настаўніку якасна і поўна правесці тэматычны кантроль па адпаведнай тэме.

Тэксты для тэматычнага кантролю ўзяты з выдання "Зборнік твораў для дадатковага чытання ў 8 класе. Мінск : Беларусь, 2018. 351 с."

Заданні распрацаваны на матэрыяле наступных твораў:

1) Раіса Баравікова "Казімір — сын Ягайлы + Насця з 8 "Б" = ♡" (тэмы "Тэкст", "Паўтарэнне вывучанага ў V–VII класах");

2) Вячаслаў Адамчык "Дзікі голуб" (тэма "Словазлучэнне: будова, значэнне, ужыванне");

3) Іван Навуменка "Пераломны ўзрост" (тэма "Двухсастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне", "Галоўныя члены сказа");

4) Віктар Карамазаў "Прыліпала" (тэма "Даданыя члены сказа");

5) Міхась Стральцоў "Адзін лапаць, адзін чунь" (тэмы "Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне", "Няпоўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне");

6) Уладзімір Караткевіч "Лісце каштанаў" (тэма "Сказы з аднароднымі членамі сказа: будова, значэнне, ужыванне");

7) Уладзімір Караткевіч “Лісце каштанаў” (тэма “Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі: будова, значэнне, ужыванне”).

8) Іван Чыгрынаў “Бульба” (тэмы “Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне”, “Сказы з пераўнальнымі зваротамі”).

9) Іван Пташнікаў “Львы” (выніковы тэст).

Заданні тэматычнага кантролю складзены ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай, адпавядаюць пяці ўзроўням засваення вучэбнага матэрыялу.

Праверку тэставых заданняў неабходна здзяйсняць у адпаведнасці з “Метадычнымі рэкамендацыямі па складанні і ацэньванні тэставых работ па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” (2022 г.).

Дапаможнік можа быць выкарыстаны падчас распрацоўкі тэматычнага кантролю або яго правядзення на ўроках беларускай мовы, пры засваенні вучнямі той ці іншай марфалагічнай нормы. Пры падрыхтоўцы школьнікаў да выніковай атэстацыі ці ўступных іспытаў складзеныя заданні дапамогуць актуалізаваць раней вывучанае.

# ТЭКСТ. ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў V–VII КЛАСАХ

## ВАРЫЯНТ 1

Прачытайце тэкст і выканайце заданні да яго.

(1) Кудлаценькі сабака Дзік — помесь тэр’ера са звычайным дварняком а пятай гадзіне жнівеньскай раніцы ляжаў пад лаўкай, паклаўшы[1] галаву на пярэднія лапы. (2) Дзік драмаў. (3) Яго гаспадыня, дворнічыха цётка Маня, пайшла ў падсобку, што[2] месцілася побач з шостым пад’ездам вялікага шматкватэрнага дзевяціпавярховага дома, каб выкаціць адтуль кантэйнер са смеццем, па[3] які раніцай павінна прыехаць машына. (4) Дзіку падабаліся гэтыя прахалодныя раннія хвіліны, калі яшчэ не снуюдаюць туды-сюды людзі, не крычаць дзеці, не гудуць аўтамабілі, — самы час паляжаць у цішыні і спакоі, калі (ні)што не трывожыць, не раздражняе слых. (5) І раптам мокрыя ноздры Дзіка **заварушыліся**. (6) Ён глыбока ўдыхнуў паветра раз, другі… (7) Пах быў чужы, (не)знаёмы яго тонкаму сабачаму нюху, такога яму[4] яшчэ (ні)колі (не)даводзілася чуць. (8) Ён даносіўся з глыбіні двара, дзе знаходзілася дзіцячая пясочніца, і быў такі рэзкі і (не)чаканы, што Дзік імгненна ўстрывожыўся. (9) Ён натапырыў вушы і[5] раслюшчыў вочы, якія адразу акругліліся ад здзіўлення. (10) Сабака міжволі прыўзняў галаву *(Паводле Раісы Баравіковай).*

**1.** Вызначце стыль тэксту:
1) гутарковы;
2) навуковы;
3) мастацкі;
4) афіцыйны;
5) публіцыстычны.

**2.** Вызначце тып тэксту:
1) апавяданне;
2) разважанне;
3) апісанне;
4) аповесць;
5) раман.

**3.** Вызначце тып сувязі сказаў у тэксце:
1) паслядоўная сувязь;
2) паралельная сувязь.

# ЗМЕСТ


Ад аўтара . . . . . . . . . . 3

Тэкст. Паўтарэнне вывучанага ў V–VII класах
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 5
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 7

Словазлучэнне: будова, значэнне, ужыванне
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 9
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 11

Двухсастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне. Галоўныя члены сказа
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 13
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 15

Даданыя члены сказа
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 17
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 20

Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне. Няпоўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 22
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 24

Сказы з аднароднымі членамі сказа: будова, значэнне, ужыванне
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 27
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 29

Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі: будова, значэнне, ужыванне
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 31
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 33

Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне. Сказы з параўнальнымі зваротамі
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 35
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 37

Выніковы тэст
Варыянт 1 . . . . . . . . . . 40
Варыянт 2 . . . . . . . . . . 41

Адказы . . . . . . . . . . 44

Спіс выкарыстаных крыніц . . . . . . . . . . 50